# Паездка пожылых грамадзян у Сулу

22 мая 2019 года у рамках клуба «Турысты-аптымісты» для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" была арганізавана паездка ў Парк-музей інтэрактыўнай гісторыі Сула.

Сула- гэта тое месца, якое не пакіне нікога абыякавым. Прыгожае, стылізаванае пад даўніну, дагледжанае і прыгожа афармленае беларускае месца для адпачынку. Людзі, культура, атмасфера, прырода - усе гэтыя складнікі ствараюць выдатныя эмоцыі і ўражанні.

Мы радуемся, што пабылі ў такім цікавым кутку нашай Беларусі і ганарымся людзьмі, якія адраджаюць гісторыю нашай краіны.







